Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЖНІЎНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 156 (28266)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Як адрамантаваць антэну ў вёсцы

СТАР. 3





Моладзь цікавіцца выбарамі

СТАР. 4



Друкарскі станок, як у Скарыны

СТАР. 11

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір ЦУМАРАЎ, старшыня Магілёўскага гарвыканкама:**

*«Работа мясцовай улады павінна быць скіравана на тое, каб забяспечыць нармальную жыццядзейнасць горада і яго насельніцтва. Для гэтага мы павінны максімальна аператыўна вырашаць праблемныя пытанні гараджан. Прычым вырашаць, думаючы не толькі пра сённяшні дзень, але і пра аддаленую перспектыву».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9482 | ▼ |
| Еўра | 2,1764 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0303 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0777 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

ПРАКАВЕТНАЕ



# Макаўе на крыніцы



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Крыніца каля вёскі Гута, што ў Рагачоўскім раёне, заўсёды шанавалася мясцовымі жыхарамі як святыня, як абярэг. Асабліва ў дзень Макавея, 14 жніўня. Макаўе — так спрадвеку называлі кірмаш каля гутнянскай крыніцы, асноўным таварам на якім быў мёд. Цяпер кірмашы і фэсты каля святога месца ўжо не ладзяцца, але па-ранейшаму жыхары Рагачоўскага і недалёкага Быхаўскага раёнаў збіраюцца, каб памаліцца і набраць гаючай вады.**

СТАР. 13

Rio 2016

# Першая. Алімпійская. Залатая

## Найвышэйшую ўзнагароду прынёс краіне Уладзіслаў Ганчароў

**20-гадовы ўраджэнец Віцебска стаў алімпійскім чэмпіёнам у скачках на батуце. Гэта першае беларускае «золата» ў Бразіліі і першы беларускі чэмпіён у гэтым відзе праграмы. Лік медалям нашы спартсмены адкрылі ў пятніцу.**

СТАР. 7













■ Спецыяльны рэпартаж

# ДЗЕ ЯБЛЫКУ ЎПАСЦІ?

## Што рабіць з лішкамі ўраджаю

**Дзятлаўскі раён Гродзенскай вобласці можа пахваліцца велізарнымі, некалі шчодра пладаноснымі яблыневымі садамі. Ды і цяпер здаецца, што на дрэве няма ніводнай галінкі, не занятай маленечкім яблыкам.**
**У гэтым і ўся праблема: багаты ўраджай складаецца з агромністай колькасці не надта апетытнай дробязі, прыдатнай хіба што для закатак. Але ж не кожнай сям'і пад сілу справіцца з такім аб'ёмам варэнняў і кампотаў. Выйсце з'яўляецца само сабой: кожны дзень па вёсках раз'язджаюць прадстаўнікі мясцовага завода, што спецыялізуецца на перапрацоўцы садавіны, якія з радасцю гатовы прыняць не патрэбныя гаспадарам яблыкі. Мы высветлілі, што ўдасца набыць на атрыманыя грошы, куды яшчэ можна ўладкаваць лішкі ўраджаю і якім павінен быць сучасны сад.**

## Прыедуць гарантавана

На гадзінніку няма яшчэ і 8 гадзін раніцы, а ў вёсцы Малдавічы назіраецца нязвыклае ажыўленне. То з аднаго, то з другога дома на дарогу выходзіць «разведчык» і напружана ўглядаецца ўдалеч. У гэты час іншыя члены сям'і спешна рухаюцца па садзе: у апошні момант, які (па сакрэце) і з'яўляецца найбольш прадуктыўным, яны стараюцца назбіраць яшчэ хоць трохі. «Вось гэты мяшок запоўнім і ўсё. Ну добра, гэтае дрэва паабтрэсваем — і тады ўжо сапраўды ўсё». У выніку завяршаецца працэс зборкі, толькі калі запоўненая машына ўжо збіраецца з'язджаць.

Нягледзячы на тое, што забіраюць яблыкі кожны дзень, сярод тых, хто ўдарна папрацаваў, можна заўважыць хваляванне: а раптам усё-такі падвядуць? Такое стаўленне выпрацавалася за доўгія гады, пакуль працэс прыёму не быў падпарадкаваны аніякай сістэме. Яшчэ пяць гадоў назад час і нават дзень прыходу машыны па яблыкі для жыхароў вёскі заставаўся загадкай.

СТАР. 5